# Шчасце жыць на сваёй зямлі!

**Выстаўка «На сваёй зямлі» ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» падвяла вынікі X Міжнароднага конкурсу жывапісу і графікі дзяцей і моладзі.**

Узрост таленавітых мастакоў ад 4 да 21 года. Паводле старшыні журы конкурсу мастака Леаніда Гоманава, пры адборы карцін улічваліся вобразнасць выразнасць, арыгінальнасць, здольнасць раскрыць ідэю, выкарыстоўваючы шырокі арсенал мастацкіх сродкаў.

У экспазіцыю ўвайшлі 463 дзіцячыя творы на тэмы: «На сваёй зямлі», «Слова аб палку Ігаравым», «Апавяданні, казкі і байкі Л. М. Талстога», «Мая сям'я», «Во саду ли, в огороде», «Вандроўка», «Мы гуляем, мы танцуем, мы спяваем!», «Зімовыя матывы».

Падчас адкрыцця выстаўкі адбылася цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў I, II, III ступеняў. Так, кіраўнік Мінскага міжнароднага жаночага клуба і жонка Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Індыі ў Рэспубліцы Беларусь Анаміка Бхарці разам са старшынёй журы конкурсу Леанідам Гоманавым уручылі медалі, дыпломы і прызы Ангеліне Кабановіч (дыплом I ступені), Лізавеце Канановіч (дыплом I ступені), Яну Лысаму (дыплом II ступені), Дар'і Усціненка (дыплом II ступені), Зосі Шаціла (дыплом III ступені), Вікторыі Калівошка (дыплом III ступені) і іншым.

Міжнародны конкурс жывапісу і графікі «На сваёй зямлі» праводзіцца ў Беларусі з 2006 года. Сёлета ўзялі ўдзел 13 257 юных мастакоў з 34 краін свету: Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Балгарыі, Грузіі, Індыі, Казахстана, Кітая, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Партугаліі, Расіі, Украіны, Чэхіі ды іншых.

Арганізатары мерапрыемства — Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, грамадская арганізацыя «Беларускі зялёны крыж».



*Вікторыя Калівошка «Я і мой хамячок Піп».*

Выстаўку можна наведаць да 25 красавіка.

**Таццяна ШЫМУК**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ